Фольклорный архив учебно-научной лаборатории белорусского фольклора работает по пяти основным направлениям:

1. обеспечение сохранности культурно-фольклорного наследия Республики Беларусь;
2. комплектование путем сбора информации по стране;
3. обеспечение доступности собранного материала для потребностей заинтересованных лиц;
4. создание системы научно-справочного аппарата к документам архива;
5. перевод хранения записей из аналоговых форматов в цифровой с дальнейшей обработкой в зависимости от задач использования этих записей.

До недавнего времени создание научно-справочного аппарата к документам фольклорного архива учебно-научной лаборатории белорусского фольклора БГУ, как правило, сводилось к усовершенствованию описей к фондам, пополнению каталогов, созданию тематических и пофондовых картотек и указателей. Однако на текущий момент такая система не обеспечивает доступность архива и, более того, не обеспечивает его сохранность. *Главная задача архивов фольклорного творчества на сегодняшний день, по мнению разработчиков проекта, обеспечить исследователя, обращающегося к фольклорному архиву, ретроспективной информацией.* Причем на современном этапе архивист должен не просто это сделать, а сделать оперативно.

Важнейшей перспективой развития фольклорного архива филологического факультета БГУ стало решение следующей сверхзадачи: на основании фольклорных материалов разных видов и жанров был создан «Эталонный фольклористический мультимедийный банк данных», представляющий собой совокупность программного обеспечения и мультимедийной информации. Это единственный логичный комплекс со следующими элементами:

1) мультимедийная информация, представляющая собой коллекцию видео- и аудио- данных, записанных в цифровом виде с использованием методов компрессии, которые позволяют делать сжимание с минимальной потерей качества;

2) база-каталог – база данных, которая позволяет сформировать логичную структуру по видам и жанрам фольклора. Кроме иерархической структуры, база данных должна позволить сохранять дополнительную пояснительную информацию к фольклористическим объектам банка данных (аннотации, характеристики, места записей, информантов и т.п.);

3) интерфейс пользователя – программная среда на базе веб-технологий, которая позволяет осуществлять управление и манипуляцию записями базы-каталога и элементами Эталонного банка. Кроме того, данная система имеет в виду наличие поисковых, сортирующих и аналитических возможностей;

4) мультимедийные справочники-энциклопедии, отобранные по жанрово-видовому, географическому и тематическому принципам из Эталонного банка данных.

Таким образом, работа в фольклорном архиве филологического факультета БГУ по всем вышеназванным направлениям проходит на основе единых методических подходов и «однородного» программного обеспечения. Это позволит архиву превратиться из информационной системы «для себя» в информационную систему «для общества». Однако следует заметить, что процесс этот небыстрый, кропотливый, без учета этих факторов может пострадать качество информационного продукта в части достоверности информации.

*Алег Аляхновіч*

## МАСТАЦКІЯ ФОРМЫ ГАРАДСКОЙ СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX–ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯЎ

*Aleh Aliakhnovich*

## ART FORMS OF URBAN FESTIVE CULTURE OF BELARUS IN THE 2nd HALF OF THE 19th-EARLY 20th CENTURY

*У артыкуле аналізуецца відовішчны эстэтычны кампанент мастацкіх форм гарадской святочнай культуры вызначанага гістарычнага перыяду. Раскрываецца шэраг прычын трансфармацыі вясковых абрадаў і святаў, высвятляецца іх уздзеянне на фарміраванне новых святочных формаўтварэнняў.*

*The article analyzes the spectacular aesthetic component of urban art forms in festive culture of a certain historical period. A number of reasons for the transformation of rural rites and celebrations are revealed, their influence on the formation of new festive formings are analyzed.*

Важнай асаблівасцю гарадской святочнай культуры Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. з'яўлялася яе афіцыйная скіраванасць. Апошняя тлумачылася ўваходам Беларусі ў склад Расійскай імперыі. У гэты час у беларускіх гарадах атрымалі распаўсюджванне разнастайныя віды і формы свят, а таксама юбілейныя мерапрыемствы, прысвечаныя арганізацыі шматлікіх імпрэзаў, памятных дат расійскай гісторыі, ваенных перамог і падзей жыцця расійскіх манархаў [5, с. 296].

Большасць гэтых юбілеяў ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам спецыяльных камітэтаў, у склад якіх уваходзілі мясцовыя чыноўнікі і кіраўнікі дваранства. Яны імкнуліся ўвасобіць у святочных дзеях ідэалогію пануючага класа. Так, у 1885 г. у Гродне ў юбілеі, прысвечаным 1000-годдзю з дня смерці Св. Мяфодзія, праводзілася ідэя адзінства праваслаўных славян. Гэта тлумачылася жаданнем афіцыйных улад нівеліраваць этнакультурныя і рэлігійныя адрозненні, якія існавалі сярод насельніцтва заходніх губерняў.

Асабліва актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні юбілею, прысвечанага 900-годдзю хрышчэння Русі, прымалі дзяржаўныя ўлады. Так, у 1888 г. у Гродне губернатар зацвердзіў падрабязную праграму гэтага святкавання, якая прадугледжвала спыненне працы ў гэты дзень, падрыхтоўку народа да ўрачыстасці, тлумачэння яму значэння хрышчэння Русі, навучанне вучняў народных вучылішчаў, царкоўна-прыходскіх і іншых школ спевам, малітвам і песнапенням Св. князю Уладзіміру і інш. З асаблівай урачыстасцю праведзена начная служба ў храме, які быў ярка асветлены і ўпрыгожаны зелянінай. Па-мастацку былі аздоблены перад алтаром іконы Св. Уладзіміра і Вольгі гірляндамі з зеляніны і каронамі з крыжамі з жывых кветак, а шлях да вуліцы пасля выйсця народу з сабора асвятляўся бенгальскімі агнямі. На другі дзень,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасля літургіі пад гукі ўсіх званоў горада быў наладжаны крыжовы ход з Сафійскага сабора да Каложскай царквы, дзе адбылося асвячэнне вады ў р. Нёман.

Значнай культурнай падзеяй у Расійскай імперыі стала святкаванне 100-гадовага юбілею вайны 1812 г. Гэта святочнае мерапрыемства праводзілася і ў гарадах беларускіх губерняў, напрыклад, Кобрыне, Полацку, Навагрудку, Віцебску, Чашніках і інш. У Кобрыне, апрача літургіі ў храмах, адбыўся крыжовы ход да месца, дзе планавалася ўзвядзенне помніка, прысвечанага бітве пад Кобрынам. Таксама было арганізавана народнае гулянне, спаборніцтвы, гралі ваенныя духавыя аркестры, вуліцы былі аздоблены гірляндамі і каляровымі сцягамі. Свята доўжылася два дні і скончылася ўвечары грандыёзным фейерверкам. У свяце горада прынялі ўдзел шматлікія дэлегацыі ад вайсковых часцей, якія ўзначальвалі камандзіры ў суправаджэнні ваенных аркестраў і сцягаў.

Па падобным сцэнарыі адбыліся юбілейныя ўрачыстасці да стагоддзя 1812 г. у Навагрудку. На Рынкавай плошчы прайшло набажэнства з удзелам вялікай колькасці вернікаў. Горад быў упрыгожаны рознакаляровымі гірляндамі і сцягамі, а на плошчы быў устаноўлены аналой і разасланыя дываны. Раніцай 26 жніўня 1912 г. ва ўсіх храмах горада адбыліся літургіі, у тым ліку набажэнства і ў галоўнай сінагозе з удзелам хору і аркестра, што на думку афіцыйных прадстаўнікоў павінна было падкрэсліць міжэтнічную згоду сярод гараджан. Цэнтральнай падзеяй свята стаў крыжовы ход прадстаўнікоў розных сацыяльных груп насельніцтва, у тым ліку мясцовых гараджан і сялян, па вуліцах горада, які закончыўся на Рынкавай плошчы. Фіналам свята з'явіўся цырыманіяльны марш войскаў мясцовага гарнізона, а таксама пажарнай каманды і навучэнцаў гарадскіх вучылішчаў, пад гукі духавых аркестраў.

Адмысловы ідэалагічны кірунак надаваўся ў 1913 г. святу 300-годдзя праўлення Раманавых. Губернатары атрымалі інструкцыі па яго правядзенні, якія, у сваю чаргу, дасылалі падначаленым. У інструкцыі прапаноўвалася стварэнне на кожным узроўні святочных камітэтаў і ўключэнне ў склад павятовых камітэтаў членаў розных дзяржаўных органаў і ўстаноў.

Афіцыйная святочная культура была палітызаванай. Яе прадстаўнікі забаранялі святкаванне ў заходніх рэгіёнах памятных падзей, якія закраналі гісторыю Рэчы Паспалітай.

З цягам часу на тэрыторыі заходніх губерняў пачынае фарміравацца ўласная афіцыйная традыцыя. Так, насуперак святкаванню юбілею Брэсцкай царкоўнай уніі на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, у самім Брэсце была наладжана памінальная паніхіда па праціўніках уніі і ўніяцтва, а сама царкоўная ўнія прызнана як вялікае злачынства [3, с. 68].

Варта адзначыць, што гарадская святочная культура з'яўлялася часткай духоўнай культуры заходніх губерняў і ўключала розныя віды і мастацкія формы святаў, абрадаў, рытуалаў, цырымоній і звычаяў, атрыбутаў і знакаў [2, с. 3–4].

У той час на дзяржаўным узроўні святочныя дні вызначаліся ў календары як «табельные дни», г. зн. вольныя ад працы, калі гараджане маглі адпачыць, задаволіць свае эстэтычныя і духоўныя патрэбы, узнавіць фізічныя сілы.

Сярод гарадоў беларускіх губерняў асаблівае месца займаў Полацк, які лічыўся старажытным, быў цэнтрам праваслаўя, гандлю і культуры, меў святыні – Сафійскі сабор і Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр, з'яўляўся крэпасцю ў войнах другой паловы XVI – сярэдзіны XVII стагоддзя.

Важным святочным мерапрыемствам Полацка было адкрыццё ў 1850 г. помніка ў памяць падзей 1812 года, які сімвалізаваў яшчэ шэраг ваенных перамог Расійскай імперыі. На свяце прысутнічалі адказныя дзяржаўныя і царкоўныя асобы, якія прынялі ўдзел у крыжовым ходзе і арганізацыі цырыманіяльнага маршу мясцовых кадэтаў. Увогуле армейскія святы наладжваліся вельмі часта, яны вызначаліся каставасцю і складанай іерархіяй: святы відаў і радоў войск, а таксама палкавыя, батальённыя і ротныя. Часта сцэнарыі ўключалі ілюмінацыі, балі, парады, фейерверкі, літургіі, танцы, літаратурныя чытанні, выступленні музыкаў і інш.

Святочная культура Полацка ўтварала сімбіёз з Праваслаўнаю Царквою, які ажыццяўляўся пад кіраўніцтвам дзяржаўнага ведамства – Свяцейшага Сінода. Не выпадкова ў Полацку адбыўся сабор, на якім была ліквідавана Брэсцкая царкоўная ўнія. Тут жа ў 1864 годзе святкаваўся яе 25-гадовы юбілей, а ў 1889 годзе адбыўся 50-гадовы юбілей аб'яднання грэка-ўніяцкай царквы з праваслаўнаю.

Яшчэ адным знакавым святам было перанясенне мошчаў Еўфрасінні Полацкай з Кіева ў Полацк. Гэта падзея адбылася вясной 1910 года і доўжылася 12 дзён. Мошчы святой вёз па Дняпры параход, упрыгожаны зелянінай і кветкамі, які суправаджалі яшчэ тры параходы. Яны рухаліся з прыпынкамі ў Любечы, Рэчыцы, Рагачове, Быхаве, Магілёве і Оршы. Паўсюдна на прыпынках наладжваліся набажэнствы. З Оршы, дзе сабралася шмат народу, святыню з крыжовым ходам панеслі ў Віцебск, а затым у Полацк.

У вызначаны гістарычны перыяд поруч з існаваннем афіцыйнай гарадской святочнай культуры ўзнаўляліся таксама вясковыя абрады і святы. У гэты час яны пачынаюць губляць сувязі з каляндарным ці земляробчым цыкламі. Ва ўмовах горада знікае, выкарыстоўваючы мову сучаснага чалавека, аўтэнтыка рытуальных дзей: з'ўляецца перашкода паміж выканаўцамі і гледачамі, абмяжоўваецца магчымасць імправізацыі выканання, свабода паводзін і нязмушанасць пераймання абраду.

У горадзе абрад ці свята ўспрымаюцца як мерапрыемствы: яны прымеркаваны да канкрэтнай даты, маюць вызначаны сцэнарый і месца правядзення, у яго падрыхтоўцы прымаюць удзел прадстаўнікі ўлад ці арганізацый.

Жыццё гараджаніна рэгламентавалася не прыроднымі працоўнымі каляндарнымі цыклямі, як у вёсцы, а яго прафесіяй, уладай, рэлігійнай прыналежнасцю, месцам пражывання. У сувязі з гэтым новыя святочныя цыклы фарміраваліся пад уплывам рэальных рытмаў паўсядзённага жыцця, а традыцыйныя святы забываліся, тэрміны іх правядзення парушаліся, яны пастулова набывалі «цырыманіяльны» характар.

Што тычыцца ўласна стану мастацкіх форм сельскай абрадава-святочнай культуры ў гарадскіх умовах, то ён набывае элементы тэатралізацыі рытуальных дзей, перавагу вербальных форм над невербальнымі.

Важнае значэнне для адаптацыі абрадаў і свят у горадзе, а таксама кампенсацыі страты імі натуральнага бытавання меў іграві пачатак традыцыйнай святочнай культуры. Ён дазваляў чалавеку быць вольным, рэалізаваць свае творчыя магчымасці, мець уладу над рэальнасцю, пераадолець залежнасць ад акаляючай рэчаіснасці.

Такім чынам, святочная культура гарадоў Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. вызначалася разнастайнасцю відаў мастацтва, відаў дзейнасці і мастацкіх форм, многія з якіх у трансфармаваным выглядзе дайшлі да нашых дзён. Гэта адносіцца найперш да афіцыйнай святочнай культуры мінулага, яе ўздзеяння на развіццё і ўмацаванне сучаснай беларускай дзяржаўнасці, нацыянальнай, сацыякультурнай, этнаканфесійнай адметнасці і згоды сярод насельніцтва, фарміраванне дзяржаўных свят і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тагачасныя прадстаўнікі дзяржаўных уладаў разам з кіраўнікамі дваранства і рэлігійнымі асобамі распрацоўвалі сцэнарыі арганізацыі і правядзення розных святаў, з'яўляліся іх своеасаблівымі «рэжысёрамі».

Многія мастацкія формы згаданага перыяду гарадской святочнай культуры не толькі пераасэнсоўваюцца, але падлягаюць рэстаўрацыі і рэканструкцыі, напрыклад, шляхецкія балі, старадаўнія танцы, крыжовыя ходы (шэсці), набажэнствы, ілюмінацыі, фейерверкі, мастацкія аздабленні залаў, замкаў і інш. Такія паняцці, як «ідэалогія», «палітызацыя», «рэлігія» знаходзяць далейшае выкарыстанне на новым узроўні мастацкага мыслення ў дзяржаўных святах, а таксама ў сімбіёзе гэтых свят з народнымі, з'яўляюцца атрыбутам суверэннасці і незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Што тычыцца існавання абрадава-святочнай культуры на неафіцыйным узроўні, то яна праяўлялася ў жыццядзейнасці некалькіх этнаканфесійных аб'яднанняў, якія ўзнаўлялі яе па-свойму.

На сучасным этапе пры ўзнаўленні абрадаў і святаў заўважаецца імкненне ўвасобіць іх язычніцкую аснову. Пры гэтым яны дэтэрмінуюцца хрысціянскай ідэалогіяй – праваслаўнай і каталіцкай, утвараючы часам сінтэз язычніцкіх і хрысціянскіх вераванняў. Цяпер найбольш распаўсюджанай мастацкай формай узнаўлення абрадаў і свят, як паказвае практыка, з'яўляецца стылізацыя.

На наш погляд, афіцыйная скіраванасць гарадской святочнай культуры абумовіла фарміраванне яе ідэалагічнай, палітычнай і культурнай спецыфікі. Яна адбілася на асаблівасцях мастацкіх форм святочнай культуры мінулага, вывучэнне якіх дазваляе глыбей зразумець прычыны трансфармацыі сучасных гарадскіх свят.

**Спіс літаратуры:**

1. Котлярчук, А. Праздничная культура в городах России и Белоруссии в XVII в. : официальные церемонии и крестьянская обрядность / А. Котлярчук. – СПб. : Петербургское Востоковедение, 2001. – 240 с.
2. Некрылова, А. Русские народные городские праздники, увеселения и зрелища. Конец XVIII – начало XX века / А. Некрылова. – СПб. : Искусство, 1984. – 191 с.
3. Раманаў, С. Афіцыйная святочная культура ў гарадах Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / С. Раманаў // Учен. зап. : сб. науч. тр. / Витеб. гос. ун-т. – Витебск, 2013. – Т. 16. – С. 64–70.
4. Раманаў, С. Святочная культура Полацка другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя / С. Раманаў // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. – 2014. – № 1. – С. 33–37.
5. Соркіна, І. Гістарычная палітыка ў Гродне ў другой палове XIX – пачатку XX ст. паводле матэрыялаў архіўных фондаў мясцовай адміністрацыі / І. Соркіна // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава, XV–XX стст. / пад рэд. А. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мінск : Зміцер Колас, 2012. – С. 291–311.
6. Цимбаев, К. Православная Церковь и государственные юбилеи Императорской России / К. Цимбаев // Отечественная история. – 2005. – № 6. – С. 42–51.
7. Яшчанка, А. Гомель у другой палове XIX – пачатку XX ст. : гісторыка-этнаграфічны нарыс / А. Яшчанка. – Гомель, 1997. – 80 с.

*Ірына Надольская*

## АЎТЭНТЫЧНЫЯ ФАЛЬКЛОРНЫЯ МАТЫВЫ Ў МАСТАЦКІХ ТЭКСТАХ І ЛАНДШАФЦЕ

*У дадзеным артыкуле прасочваецца ўплыў нацыянальнага эпасу і аўтэнтычнага фальклору на розныя віды мастацтва канца XVIII – XIX стст., асаблівая ўвага звернута на відарысы паэтычных тэкстаў у садова-паркавай прасторы. Мэтай азначана выяўленне своеасаблівасцей артыкуляцыі фальклорных матываў і ўзнікнення аўтэнтычнага сядзібнага міфа на Беларусі.*

*Iryna Nadolskaya*

## AUTHENTIC FOLKLORE MOTIFS IN ARTISTIC TEXTS AND LANDSCAPE

*The article presents a comparative analysis of ossianism in literature and art of the late 18-19$^{th}$ centuries, in particular the visualization of poetic texts in the garden and park space. The aim of the study is to identify the features of landscape articulation of folklore motifs and the emergence of an authentic manor myth in Belarus.*

У канцы XVIII ст., а дакладней у 1760-х гадах, у Еўропе былі апублікаваны творы шатланскага барда Асіяна, аўтарам якіх з'яўляўся Д. Макферсон. Гэтыя творы набылі велізарную папулярнасць і падштурхнулі паэтаў Заходняй і Усходняй Еўропы і Расіі звярнуцца да нацыянальнага эпасу і аўтэнтычнага фальклору; пачаўся перыяд росквіту рамантычнай балады. У Заходняй Еўропе літаратурная плынь асіянізму закранула адначасова некалькі відаў мастацтва: тэатральнае, выяўленчае і садова-паркавае. Па сюжэтах асіянінскіх балад узнікалі оперы і балеты, а апісальныя матывы абудзілі інтарэс да экзатычна-суровых краявідаў Шатландыі. У Расіі аналагічны зварот быў накіраваны да тэкстаў «Калевалы» і паўночных пейзажаў Фінляндыі. Усходнееўрапейскія краіны, менавіта Беларусь, звярнуліся да ўласнага эпасу і аўтэнтычнага фальклору.

У Еўропе і Расіі ўзаемасувязі паміж рознымі відамі мастацтва і літаратурнай плынню асіянізму вывучаюцца дасканала. Да ліку буйных прац рускіх навукоўцаў належаць даследванне К. В. Васілевіч [1] і першы досвед у гэтай тэме ў манаграфіі Д. С. Ліхачова [2]. З сучасных замежных даследванняў можна вылучыць Д. Моор [3]. У нашай краіне тэма асіянізму практычна не распрацавана; у навуковай працы выдатных беларускіх філолагаў І. Ф. Штэйнера [4] і Т. І. Шамякінай [5] разглядаецца станаўленне рамантычнай балады на падмурку фальклорнага эпасу.

Фальклорныя матывы абудзілі цікавасць да стварэння згадкавых, таямнічых міфапаэтычных відарысаў дзікай прыроды ў моўных і жывапісных тэкстах і ўвасаблення іх у пейзажных парках. У агульную кампазіцыю такога пейзажу ўваходзілі групы камянёў з выразным графічным абрысам (падобныя да шатланскіх хайкаў) каля стромкага берага вадаёма, альбо аталяючых вадаспад. Расліны ў пасадках таксама мелі графічныя рысы: сярод дрэў перавага надавалася елкам, соснам і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ